CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

| WYPEŁNIA ZDAJĄCY | |
|---|---|
| KOD | PESEL |

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# Egzamin maturalny *Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Symbol arkusza*
MMBB-P0-**100**-2405

DATA: **17 maja 2024 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

| WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY |
|---|
| Uprawnienia zdającego do: ☐ dostosowania zasad oceniania. |

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

## Instrukcja dla zdającego

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 20 stron (zadania 1–14). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
4. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
5. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
6. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w tabelkach przeznaczonych dla egzaminatora. Tabelki są umieszczone na marginesie przy każdym zadaniu.
8. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
9. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
10. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2022/2023 i 2023/2024 (zgodna z wymaganiami egzaminacyjnymi)**

**Poziom podstawowy**

Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Біблii*
Ян Баршчэўскі, *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* (*Плачка*, выбраныя фрагменты)
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы*, *Мужыцкая праўда № 1*
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай, Калыханка,* выбраныя вершы
Змітрок Бядуля, *На Каляды к сыну, Пяць лыжак заціркі*
Цётка, *Шануйце роднае слова*
Максім Багдановіч, *Апокрыф, Хто мы такія, Санет*, выбраныя вершы
Максім Гарэцкі, *Рускі, Стары прафесар*
Янка Купала, *Курган, Незалежнасць*, *Явар і каліна*, *Спадчына*, выбраныя вершы
Якуб Колас, *Новая зямля*, *Што яны страцілі*
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская…*, выбраныя вершы
Янка Брыль, *Галя, Маці*
Ян Скрыган, *Слепата*
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*)
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі*, *Дарога праз лес*
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*), *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*
Сакрат Яновіч, *Гасцінец*, *Прыгожай, Бацькаў гнеў*, *Вёха – багіня ганьбы*
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві...*, выбраныя вершы
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай)
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*
Алесь Барскі, *Беластоцкі край, Я сын зямлі беластоцкай...*, *Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*)
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1-га раздзела часткі другой)
Ігар Бабкоў, *Хвілінка* (фрагмент 6-га раздзела часткі *Паветраны шар*).

**Poziom rozszerzony**
Максім Багдановіч, *За сто лет*
Максім Гарэцкі, *Фантазія*
Якуб Колас, *У палескай глушы* (фрагмент *XVI часткі)*
Янка Купала, *Тутэйшыя*
Рыгор Барадулін, *Жыццё і паэзія*
Сакрат Яновіч, *Пад знакам Арла й Пагоні* (фрагмент *30. Эліты)*
Ларыса Геніюш, *Споведзь*
Надзея Артымовіч, *Ёсць тое...,* выбраныя вершы
Алесь Разанаў, *Sumus ne simus,* выбраныя вершы
Вольга Рымша, *Рэквіем*
Уладзімір Арлоў, *Незалежнасць – гэта...*
Барыс Пятровіч, *Трызненні* (фрагмент *Шчасце быць – 1).*

**Inne lektury obowiązkowe zamieszczone w *Informatorze o egzaminie maturalnym z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej od roku szkolnego 2022/2023*, do których również można się odwołać**

**Poziom podstawowy**
Максім Танк, *Рукі маці*, выбраныя вершы
Віктар Швед, *Беласточчына*, выбраныя вершы
Уладзімір Някляеў, *Праводзіла з дому*, выбраныя вершы
Віктар Шніп, *Жыццё, нібыта нітка Арыядны...*, выбраныя вершы.

## Część 1. Test językowy

Przeczytaj uważnie tekst, a następnie wykonaj zadania umieszczone pod nim. Odpowiadaj **tylko na podstawie tekstu** i tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

Рэгіна Гамзовіч
***Майстры, якія вырабляюць чаўны, яшчэ не перавяліся на Палессі***

Човен – лодка, выдзеўбаная з аднаго цэльнага камля дуба, які выраблялі спрадвеку майстры па берагах Прыпяці, мае адметны выгляд: востры нос і карма, доўгі корпус, пры ім адналопаснае кароткае вясло з папярэчынай на ручцы. Яго зручна было выкарыстоўваць у рыбалоўстве, перавозцы грузаў і людзей. Вясной падчас разліву човен быў адзіным сродкам руху. [...] Мае надзіва хуткі ход, але кіраваць ім трэба асцярожна. [...]

Дубоў на Палессі было багата, і чалавек з даўніх часоў аціаніў трываласць гэтага дрэва, быў удзячны за доўгую службу. Да таго ж дуб у вадзе рабіўся яшчэ мацнейшым. Такі човен амаль паўсюдна называлі „дуб”. Невялікія чаўны, на аднаго-двух чалавек, зробленыя з іншых дрэў, называюць таксама па пародзе дрэва, з якога яны зробленыя: ліпаўка, асінаўка, вярбуўка… А на Палессі іх празвалі „душагубкамі”, бо яны лёгкія, няўстойлівыя, часта пераварочваліся, ствараючы небяспеку людзям. [...]

Зрабіць човен для гаспадарчых патрэб умеў бадай што кожны мужык, бо з дзяцінства вучыўся даўбёжнаму рамяству на вырабе посуду [...], мэблі [...], майструючы кайдуб для студні і такія прыстасаванні, як ступа, калоды для бортніцтва і шмат іншага. Інструменты выкарыстоўвалі тыя ж, што і для іншых патрэб, – сякеру, цяслу, долата, разец. Сёння мала хто займаецца гэтым рамяством, хіба што для вырабу сувеніраў, каб адлюстраваць народную традыцыю. А вось чаўны па Прыпяці яшчэ плаваюць. [...] У экспазіцыі адчыненага ў 2012 годзе Музея прыроды ў Ляскавічах можна ўбачыць човен з дубу работы майстра з вёскі Перароў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці Леаніда Швяца. Мы спецыяльна адправіліся да яго ў госці, каб пазнаёміцца і параспытваць пра рэдкае рамяство, але мелі магчымасць і паназіраць, як рухаецца гэтая старадаўняя лодка, упэўніліся, што яна яшчэ выкарыстоўваецца мясцовымі жыхарамі.

Жонка Тамара Георгіеўна сустрэла мужа з рыбалкі і занялася гаспадарчымі клопатамі, а Леанід Іванавіч пачаў паказваць нам інструменты, якімі ён робіць човен. [...] Удваіх можна нават за дзень зрабіць човен, а раней чыстай работы над ім было тыдні на два. [...] Бацька Леаніда Швяца чаўны не рабіў, бо купіў адзін у майстра і карыстаўся 25 гадоў. Дзед [...] славіўся як выдатны цясляр і бондар. Яго рубанкі яшчэ служаць Леаніду ў працы. [...] Вырабляў дзед і чаўны. Праўда, ад яго Лёня навучыцца не змог, асноўныя сакрэты па вырабе чоўна перадалі яму перароўскія майстры Віктар Якубовіч і Васіль Масло. Яны казалі, што для ходкасці чоўна ён павінен быць даўжынёй не менш за пяць метраў дваццаць сантыметраў. Калі карацейшы – будзе вёрткі. А шырыня – не меншая за 65 сантыметраў. [...]

Супраць цячэння човен ідзе непараўнальна лепш, чым лодка, у гэтым яго перавага. Мы ўпэўніліся ў гэтым, калі паехалі з Леанідам Іванавічам на Прыпяць і ён сеў у свой човен. Дарэчы, на беразе іх стаяла некалькі. Мясцовыя жанчыны расказалі, што мужыкі карыстаюцца яшчэ чаўнамі і цэняць іх значна вышэй за лодкі. Дубам тут называюць

доўгія лодкі з дубовых дошак, а выдзеўбаныя з цэльнага ствала дуба – чаўнамі. [...] Перароў якраз знаходзіцца на тэрыторыі Нацыянальнага парка „Прыпяцкі”. І каму, як не жыхарам гэтай тэрыторыі, захоўваць даўнія рамёствы продкаў!

budzma.by

1.
0–1

## Заданне 1. (0–1)

**Працягні наступны сказ, выбіраючы правільны адказ сярод А–Г.**

Загаловак да тэксту адлюстроўвае

**А.** яго тэму.
**Б.** яго правакацыйны характар.
**В.** яго асноўную думку.
**Г.** яго стыль.

2.
0–1–2

## Заданне 2. (0–2)

**Ацані правільнасць сцверджанняў, змешчаных у табліцы. Пазнач ТАК, калі сцверджанне правільнае, або НЕ – калі няправільнае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | У тэксце прысутнічае лексіка абмежаванага ўжытку, напрыклад, дыялектызмы. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Словы з тэксту *рабіць, майстар, выдатны* – прыклады лексікі абмежаванага ўжытку. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | У тэксце прысутнічае агульнаўжывальная лексіка, напрыклад, *жыхар, продак*. | **ТАК** | **НЕ** |

3.
0–1–2

## Заданне 3. (0–2)

**Ці на кожнае пытанне з табліцы можна знайсці адказ у апошнім абзацы тэксту? Пазнач ТАК, калі можна адшукаць адказ, альбо НЕ – калі нельга.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Ці карыстаюцца мясцовыя жыхары тым старажытным транспартным сродкам, пра які вядзецца гаворка ў тэксце? | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Чаму людзі аддаюць перавагу чаўнам перад лодкамі? | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Якіх правіл бяспекі патрэбна прытрымлівацца, калі кіруеш лодкай на Прыпяці? | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 4. (0–2)**

**Падбяры і запішы антонімы да прыведзеных ніжэй слоў.**

гучна – ……………………………………………………………………………………………...

павольны – ……………………………………………………………………………………...….

забараняць – ……………………………………………………………………………………...……

| 4. |
|---|
| 0–1–2 |
| |

**Заданне 5. (0–1)**

**Тэкст заканчваецца клічным сказам. Растлумач сваімі словамі, якую функцыю ён выконвае ў тэксце.**

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

| 5. |
|---|
| 0–1 |
| |

**Заданне 6. (0–2)**

**На падставе прыведзенага тэксту сфармулюй два аргументы на карысць аўтарскай тэзы пра тое, што ў сучаснасці трэба працягваць традыцыйны метад вырабу чаўноў.**

1. ………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………...

2. ………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………...

| 6. |
|---|
| 0–1–2 |
| |

## Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów

Wykonaj zadania. Odpowiadaj tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

7.
0–1–2

### Заданне 7. (0–2)

**Да якога жанру належыць твор Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча *Пінская шляхта*? Пазнач правільны адказ сярод А–Г. Падай адну характэрную рысу гэтага жанру.**

**А.** камедыя
**Б.** трагедыя
**В.** паэма
**Г.** апавяданне

**Характэрная рыса:** ..................................................................................................................

### Заданне 8. (0–1)

Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент *На Каляды к сыну* Змітрака Бядулі.

Смачна ёй была сухая скарынка хлеба, а без хлеба таксама было добра... […] І давай, быццам гарачыя вуголлі, закрытыя попелам, выгартаць з сэрца наверх свае захаваныя жаданні, сваю глыбокую веру ў даражэнькага сына... […]

Цешылася маці:

– Во будзе падмога на старасць!

Цыпрук на гэта ёй часта гаварыў:

– Эт, дурная ты авечка. Яго падмогу сарока хвастом замяце. Чакай ад яго пад старасць пацехі, як ад рабой сучкі яек!

– Замаўчы ўжо! Стары, як малы! […]

Стукалася, стукалася яна ў дзверы, пакуль нехта адчыніў. […]

Тым часам адчыніліся дзверы з другой стараны ды ўвайшоў малады пан у чорным сурдуце...

– Лаўручок мой! Сынок! – як непрытомная, кінулася да яго Тэкля...

– Роднен...

Ён раптам пачырванеў, паглядзеў на слуг ды хрыпла крыкнуў:

– Чаму вы пускаеце ў пакой розных жабрачак шалёных?!

– Ідзі! ідзі! – звярнуўся ён да яе глуха, адрывіста, – ідзі, старушка! Я цябе... не знаю...

– А сынок мой, а Лаўручок ты мой! Маткі сваёй не пазнаеш?! Гэта ж...

Ён бразнуў дзвярамі і пайшоў у пакоі... […]

– Ад пана!..

Яна нават не чула, як з яе акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўгажаданага сына. Некалькі трохрублёвых прыліплі да макраватага тратуара...

З. Бядуля, *На Каляды к сыну* [у:] knihi.com

**На падставе фрагмента і цэлага тэксту ацані праўдзівасць наступных сцверджанняў. Калі сцверджанне праўдзівае, пазнач П, калі не – пазнач Н.**

| 8. |
|---|
| 0–1 |
| |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Апавяданне Змітрака Бядулі адпавядае прынцыпам рэалізму. | **П** | **Н** |
| **2.** | Апавяданне Змітрака Бядулі адпавядае прынцыпам рамантызму. | **П** | **Н** |

**Заданне 9. (0–2)**

Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент *Мужыцкай праўды №1* Кастуся Каліноўскага.

Дзецюкі!

Мінула ўжэ тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука здасца толькі да сахі, – цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаці, і то пісаці такую праўду справядліву, як Бог на небе. О, загрыміць наша праўда і, як маланка, пераляціць па свеце! Няхай пазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, но яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўды. […]

Шэсць лет ужэ мінула, як пачалі гаварыць а свабодзе мужыцкай. Гаварылі, талкавалі і пісалі многа, а нічога не зрабілі. А гэты маніфэст, што цар з сэнатам і з панамі для нас напісаў, то такі дурны, што чорт ведае да чаго ён падобны, – ніякай у нём няма праўды, няма з яго для нас ніякой карысці. Парабілі канцыляры, зрабілі суд, як бы гэта не ўсё роўна браць у сраку чы з судом, чы без суда. Парабілі пісараў, пасрэднікаў, а ўсё за мужыцкія грошы, і вялікія грошы – чорт іх ведае на што; для таго хіба, каб запісывалі ў ксёнжкі, як многа напішуць на сраках мужыцкіх. А з гэтага то і відаць, што нам нічога добрага і не думалі зрабіці. […]

Гэту Мужыцкую Праўду напісаў і зноў пісаці будзе Яська-гаспадар з-пад Вільні.

Кастусь Каліноўскі, *Мужыцкая праўда №1*, knihi.com

**Ацані праўдзівасць наступных сцверджанняў. Калі сцверджанне праўдзівае, пазнач П, калі не – пазнач Н.**

| 9. |
|---|
| 0–1–2 |
| |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Аўтар прыведзенага фрагмента – невядомая асоба, якая пісала пад псеўданімам. | **П** | **Н** |
| **2.** | Аўтар прыведзенага фрагмента – рэальная гістарычная постаць. | **П** | **Н** |
| **3.** | У прыведзеным фрагменце гаворыцца пра рэальныя гістарычныя падзеі, якія мелі месца ў XIX стагоддзі. | **П** | **Н** |

**Заданне 10. (0–2)**

Прачытай фрагменты верша Уладзіміра Караткевіча *На Беларусі Бог жыве*.

“На Беларусі Бог жыве” –
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль,
І продкаў запавет,
І мовы залатая сталь,
І нашых дум сусвет.
Тую праўду сцвярджае
Ўсё зноў і зноў
Ўсім лёсам, –
Няхай спакваля, –
У хмарах дубоў,
У вясёлках агнёў
Купальская наша зямля. […]
А няма нідзе
Вярнейшых сяброў
І прыгажэйшых жанчын.
Гэта край раскрытых душ і дзвярэй,
Гэты край –
Твой дом і сабор... […]
І тая памяць жыве не ў царкве,
А ў кожнай жыве галаве:
“На Беларусі Бог жыве...” –
І хай сабе жыве.
А калі ён шле на нас кару і гнеў, –
Ну што ж, – мы з ім свае:
Ў вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б'е. […]

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
“На Беларусі Бог жыве”, –
І няхай да веку жыве.

У. Караткевіч, *На Беларусі Бог жыве* [у:] knihi.com

10.
0–1–2

**Выпішы з верша па адным прыкладзе прыведзеных у табліцы тропаў.**

| троп | прыклад |
|---|---|
| **эпітэт** | |
| **метафара** | |

**Заданне 11. (0–1)**

Прачытай пададзены ніжэй фрагмент аповесці *Аблава* Васіля Быкава.

Вельмі яму хацелася падысці да грудка, каб хоць зірнуць на знаёмыя мядзяныя камлі хвой, сухі жвірысты дол, ды ён не пайшоў. Блізка было і жадана, але... Наперадзе, мусіць, чакалі яго і яшчэ болей родныя мясціны, а там, за грудком на дарозе, маглі паявіцца людзі. Свае, знаёмыя, дзеравенцы. Але сустрэчы са сваімі і знаёмымі ён баяўся болей за ўсё.

“Божа літасцівы, чаму ж я такі нешчаслівы? – звыкла падумалася Хведару, як думалася бадай штодня ўсе пяць гадоў ягоных пакут. – Жывуць людзі, спакойна ходзяць па гэтай зямельцы, і, мусіць, ніхто не ведае, як без яе. А я...” А ён, калісьці гвалтам адарваны ад яе, здаецца, здзічэў нутром ад самоты па ёй, спарахнеў розумам. Двойчы за апошні год ён уцякаў – па-дурному, без падрыхтоўкі і аніякага шанцу, дзе ж было дапяцца да ўдачы. Але во ці не пашэнціла ўсё ж, калі ўжо зніклі ўсе спадзяванкі. Здаецца, і напраўду хутка ён убачыць свой родны кут, сваё поле, стрэхі маленечкай падлеснай вёскі Нядолішча, з яе малаўрадлівымі палеткамі, балоцістым выганам і параснікамі, дзе мінулі яго маладыя гады, дзе будучыня калісь паклікала яго да незабыўнага, зманлівага шчасця. Няўжо цяпер яму надарыцца такое? Ад таго грудка па дарозе заставалася тры вярсты да канчатковае мэты яго падарожжа. Няўжо яна спраўдзіцца?

В. Быкаў, *Аблава* [у:] knihi.com

**Растлумач сваімі словамі, што сімвалізуе назва, абраная аўтарам для роднай вёскі галоўнага героя?**

| 11. |
| --- |
| 0–1 |
| |

.....................................................................................................................

.....................................................................................................................

.....................................................................................................................

**Заданне 12. (0–1)**
Прачытай пададзены ніжэй фрагмент з *Чарнобыльскай малітвы* Святланы Алексіевіч.

“Я не ведаю, пра што расказваць... Пра смерць ці пра каханне? Ці гэта адно і тое ж... Пра што?

... Мы нядаўна пабраліся. Яшчэ хадзілі па вуліцы і трымаліся за рукі, нават калі ў краму ішлі... Я казала яму: “Я кахаю цябе”. Але я не ведала яшчэ, як яго кахала... Не ўяўляла... Жылі мы ў інтэрнаце пажарнай часткі, дзе ён служыў. На другім паверсе.

І там яшчэ тры маладыя сям'і, на ўсіх адна кухня. А ўнізе, на першым паверсе стаялі машыны. Чырвоныя пажарныя машыны. Гэта была яго служба. Заўсёды я ў курсе: дзе ён, што з ім? Сярод ночы чую нейкі шум. Вызірнула ў акно. Ён убачыў мяне: “Зачыні фортачкі і лягай спаць. На станцыі пажар. Я хутка буду”.

Самога выбуху я не бачыла. Толькі полымя. Усё нібы свяцілася... Усё неба... Высокае полымя. Чад. Гарачыня страшэнная. А яго ўсё няма і няма. Чад ад таго, што бітум гарэў, дах станцыі быў заліты бітумам. Хадзілі, пасля прыгадваў, як па смале. Збівалі полымя. Гарэў графіт. Яго скідвалі нагамі... Паехалі яны без брызентавых касцюмаў, як былі ў адных сарочках, так і паехалі. Іх не папярэдзілі, іх выклікалі на звычайны пажар... ”

С. Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* [у:] knihi.com

12.
0–1

**Растлумач сваімі словамі на падставе прыведзенага фрагмента і ведаў пра гістарычныя падзеі, пра якія гаворыцца ў кнізе Святланы Алексіевіч, што мае на ўвазе гераіня *Чарнобыльскай малітвы*, кажучы пра тое, што смерць і каханне – адно і тое ж.**

.............................................................................................................

.............................................................................................................

.............................................................................................................

.............................................................................................................

.............................................................................................................

**Заданне 13. (0–1)**
**Прачытай пададзены ніжэй верш Алеся Барскага *Я сын зямлі беластоцкай*.**

Алесь Барскі

* * *
Я сын зямлі беластоцкай,
і іншай мне маці не трэба,
там сосны высока-высокія
ад зямлі да блакітнага неба.
Там рэчкі сінія-сінія
і ветры з далонямі кволымі

бягуць па зялёнай краіне,
як сябры заўсёды вясёлыя.
Там сонца прыходзіць у дрэвы,
і дрэвы да сонца імкнуцца,
і вабіць краіна нас спевам,
і просіць, і просіць вярнуцца.

А. Барскі, *Я сын зямлі беластоцкай,* [у:] В. Сянкевіч, *Са словам праз стагоддзі. Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа сярэдніх школ*, WSiP, Warszawa 2002, с. 2.

**Сфармулюй тэму верша.**

| 13. |
| --- |
| 0–1 |
| |

Тэма:.......................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 14. (0–30)**

## Część 3. Wypracowanie

Выберы **адну** з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.

- У сачыненні паразважай над **праблемай**, зададзенай у тэме. Выкладзі **сваю думку** і **абгрунтуй** яе.
- У развагах прадстаў **аргументы**, спасылаючыся на **літаратурны твор**, згаданы ў тэме, і на **іншы твор беларускай літаратуры**.
- Твая праца павінна складацца не менш чым з **250 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1.
**Якую спадчыну чалавек атрымлівае ад продкаў? Паразважай над пытаннем на падставе верша Янкі Купалы *Спадчына* і выбранага твора беларускай літаратуры.**

Янка Купала
***Спадчына***

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пастбішчы,
І крык варонiных грамад
На могілкавым кладбішчы.

Жыве з ім дум маіх сям’я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

Янка Купала, *Спадчына* [у:] knihi.com

Тэма 2.

**Чым абмежаваная свабода выбару? У адказе спашліся на апавяданне Васіля Быкава *Калі хочацца жыць* і выбраны твор беларускай літаратуры.**

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** ☐

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |
| ______ | ........................................................................ | ______ |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | | *Jeżeli 0 pkt – wskaż powód.* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Spełnienie formalnych warunków polecenia | 0 | 1 | Brak lektury obowiązkowej. | Nie dotyczy problemu. | Nie jest wypowiedzią argumentacyjną. |

| | | | | | | | | | | | Liczba błędów rzeczowych | OGÓŁEM KLiK |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2. | Kompetencje literackie i kulturowe | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | | |
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | | | | | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3a | Struktura wypowiedzi | 0 | | 1 | | 2 | 3 |
| | | G | F | E | C | D | B |

| | | Liczba błędów w spójności | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3b | Spójność wypowiedzi | | 0 | 1 | 2 | 3 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3c | Styl wypowiedzi | 0 | 1 |

| | | Liczba błędów językowych | 0 | | | | | | 1 | | | 2 | | | 3 | | | 4 | | | 5 | | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4a | Zakres i poprawność środków językowych | | 1 | 2 | 3 | 2 | 3 | 3 | 1 | 2 | 3 | 1 | 2 | 3 | 1 | 2 | 3 | 1 | 2 | 3 | 1 | 2 | 1 |
| | | | G | F | E | G | F | G | F | E | D | E | D | C | D | C | B | C | B | A | B | A | A |

| | | Liczba błędów ortograficznych | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4b | Poprawność ortograficzna | | 0 | 1 | 2 |

| | | Liczba błędów interpunkcyjnych | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4c | Poprawność interpunkcyjna | | 0 | 1 | 2 |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*


JĘZYK BIAŁORUSKI
Poziom podstawowy
Formuła 2023
JĘZYK BIAŁORUSKI
Poziom podstawowy
Formuła 2023